

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

№ 3 (231) 23 лютага 1996 года, пятніца

СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК


## Аляксандру Васільевічу Бадакову – 70 гадоў



### Шаноўны Аляксандр Васільевіч!

*Рэктарат, прафкам, прафесарска-выкладчыцкі састаў, супрацоўнікі і студэнты Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы горача і сардэчна віншуюць Вас з юбілеем!*

*Ваша шматгадовая працоўная дзейнасць - гэта нялёгкі шлях ад рабочага да вучонага, кіраўніка вышэйшай навучальнай установы. Ваша энергія, талент, выдатныя асабістыя якасці сталі асабліва відавочнымі ў перыяд працы на пасадзе рэктара нашага універсітэта. Вы шмат зрабілі, каб ён пераўтварыўся ў буйны навуковы цэнтр рэгіёна, каб навука стала бліжэй да патрэбаў народнай гаспадаркі, каб удасканальваўся навучальна-выхаваўчы працэс, паляпшалася падрыхтоўка маладых спецыялістаў.*

*Вы благаславілі на педагагічны шлях не адно пакаленне студэнтаў. Яскравым прыкладам для іх заўсёды будуць Ваша высокая кампетэнтнасць, перакананасць, фундаментальнасць думак, выдатнае араторскае майстэрства, арганізатарскія здольнасці.*

*Усюды, дзе б Вы ні працавалі, відавочны вашы выдатныя якасці вучонага і філосафа, псіхолага і педагога, арганізатара і дыпламата, нястомнага працаўніка навукі, простага і абаяльнага чалавека.*

*У дзень Вашага юбілею прыміце, шаноўны Аляксандр Васільевіч, ад калектыву Гродзенскага універсітэта нашы шчырыя пажаданні моцнага здароўя, творчага даўгалецця, вялікага чалавечага шчасця, дабрабыту і ўсяго самага найлепшага ў жыцці!*

**Л.М.КІВАЧ, рэктар Гродзенскага універсітэта,**
**У.А.ХІЛЮТА, старшыня прафкама.**



# ВІНШУЕМ ЮБІЛЯРА!

Упраўленне адукацыі аблвыканкама, педагагічная грамадскасць вобласці сардэчна віншуюць з 70-гадовым юбілеем і 50-годдзем навукова-педагагічнай дзейнасці заслужанага работніка вышэйшай школы Беларусі, прафесара Бадакова Аляксандра Васільевіча.

Выказваем шчырую ўдзячнасць за шматгадовую сумесную працу, узаемаразуменне, шчырасць, удумлівасць, паслядоўнасць у вырашэнні складаных педагагічных праблем.

Высокая патрабавальнасць да сябе, самадысцыпліна, працалюбства, уменне канцэнтраваць увагу на галоўным, здольнасць прапаноўваць цікавыя ідэі і ажыццяўляць іх - усе гэтыя якасці, характэрныя Аляксандру Васільевічу, спрыялі ўмацаванню дзелавых кантактаў паміж органамі адукацыі і дзяржуніверсітэтам.

Больш дваццаці гадоў працоўнай дзейнасці Аляксандра Васільевіча звязана з вышэйшай навучальнай установай Гродзеншчыны, якая рыхтуе педагагічныя кадры. Першыя гады на пасадзе рэктара былі гадамі сапраўды падзвіжніцкай працы, вынікам якой стала рэарганізацыя педагагічнага інстытута ў буйны навуковы цэнтр рэспублікі - дзяржаўны універсітэт.

Дзейнасць універсітэта ўсе гэтыя гады была скіравана на ўдасканаленне працэсу падрыхтоўкі высокакваліфікаваных педагагічных кадраў, выхаванне духоўна багатай, нацыянальна свядомай асобы, здольнай творча працаваць ва ўмовах сучаснай школы. Адзін з важнейшых напрамкаў працы вну - умацаванне і абнаўленне эфектыўных форм кантактаў з сярэдняй школай, вывучэнне яе праблем і тэндэнцый развіцця. Зразумела, рабіць гэта няпроста, бо ў сённяшняй школе адбываюцца супярэчлівыя працэсы, істотныя змены. Аднак вопыт сумесных пошукаў у вырашэнні надзённых адукацыйных патрэб мае багаты плён. Ён яшчэ доўгія гады будзе надзейнай апорай паслядоўнікам першага рэктара універсітэта.

У асобе Аляксандра Васільевіча органы адукацыі знайшлі аднадумца ў вырашэнні шматлікіх пытанняў, ад якіх залежыць дзейнасць галіны. Найпершая і найважнейшая праблема - забеспячэнне навучальных устаноў педагагічнымі кадрамі па неабходных спецыяльнасцях. Менавіта з улікам патрэбнасці рэгіёна ў выкладчыках замежных і польскай моў, біялогіі, пачатковых класаў, фізвыхавання, музыкі і спеваў, інфарматыкі ва універсітэце адкрыліся адпаведныя факультэты і аддзяленні, амаль на ўсіх факультэтах уведзены дадатковыя спецыяльнасці.

Практыка прыёму моладзі па мэтавых накіраваннях дапамагла вырашыць многія кадравыя пытанні ў сельскіх раёнах. Універсітэт актыўна ўдзельнічае ў стварэнні і развіцці навучальных установаў новага тыпу (школы-ліцэі, гімназія), у адкрыцці класаў з паглыбленым вывучэннем шэрагу прадметаў, дзе профільныя дысцыпліны выкладаюць высокакваліфікаваныя спецыялісты вну.

Добрай традыцыяй стала супрацоўніцтва членаў кафедр з органамі адукацыі, навучальнымі ўстановамі.

Хочацца спадзявацца, што формы супрацоўніцтва, ля вытокаў якіх стаяў паважаны юбіляр, будуць развівацца і ўдасканальвацца. Жадаем Аляксандру Васільевічу моцнага здароўя, прафесійнага даўгалецця, творчай актыўнасці.

**Упраўленне адукацыі аблвыканкама.**



# Настаўнік. Філосаф. Грамадзянін. Чалавек

23 лютага спаўняецца 70 гадоў прафесару кафедры філасофіі, беламу рэктару Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы, заслужанаму работніку вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь Аляксандру Васільевічу Бадакову. Увесь яго жыццёвы шлях - ад простага вясковага хлопца са Смаленшчыны да аднаго з буйных дзеячоў беларускай вышэйшай школы, беларускай навукі і культуры - яскравы ўзор творчай самарэалізацыі чалавека, яго бясконцага ўзыходжання, раскрыцця яго сапраўды чалавечых сутнасных сіл і магчымасцей, як фізічных, так і духоўных, узор выкарыстання і канцэнтрацыі іх на справе, якой служыш, дзеля якой жывеш, якая стала сэнсам твайго існавання і дзейнасці.

З 1960 года Аляксандр Васільевіч звязвае свой лёс з вышэйшай школай, дзе найлепшым чынам раскрыліся такія яго цудоўныя якасці, як шырокі кругагляд і эрудыцыя, высокі, сапраўды дзяржаўны ўзровень мыслення, арганізацыйныя здольнасці, здзіўляючая працаздольнасць, уменне бачыць перспектыву, своечасова заўважаць неабходнасць змен, уважлівасць, чуласць, добразычлівасць у адносінах да людзей.

Асабліва паказальнай у гэтым сэнсе з'яўляецца яго дзейнасць на пасадзе загадчыка кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага (з 1962 года па 1973 год) і на пасадзе рэктара Гродзенскага дзяржаўнага педінстытута імя Я. Купалы, з 1978 года - Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы, на якой ён працаваў больш за 20 гадоў.

Творчы запал, настойлівасць характарызуюць А. В. Бадакова ўвесь час яго працы ў нашай навучальнай установе. Многіх нашых выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў не раз здзіўлялі і захаплялі якасці Аляксандра Васільевіча, смелы творчы ўзлёт яго думак, планы на будучае, у якіх яскрава вырысоўвалася перспектыва развіцця інстытута, здольнасць літаральна "генерыраваць" ідэі і рэалізоўваць іх. Дзейнасць Бадакова на пасадзе рэктара педінстытута садзейнічала ўдасканаленню вучэбна-тэхнічнай, метадычнай базы гэтай навучальнай установы, росту прафесійнай дасканаласці выкладчыкаў і супрацоўнікаў, аптымізацыі навукова-даследчай работы, пераходу педагагічнага інстытута на якасна новы вышэйшы ўзровень. І не выпадкова, што калі на базе педагагічнага інстытута быў заснаваны універсітэт, першым рэктарам гэтага універсітэта стаў прафесар Бадакоў.

З першых дзён свайго існавання новая навучальная ўстанова заходняга рэгіёну рэспублікі - Гродзенскі універсітэт - пастаянна ўдасканальвае сваю дзейнасць, выпускаючы высокакваліфікаваных спецыялістаў, у якіх гэты рэгіён мае асаблівую патрэбу - настаўнікаў усіх спецыяльнасцей, юрыстаў, эканамістаў-міжнароднікаў, спецыялістаў сферы кіравання, інжынераў, праграмістаў і іншых. І вялікая заслуга ва ўсім гэтым Аляксандра Васільевіча як першага рэктара, які ў пэўным сэнсе вызначыў асноўныя контуры новай вышэйшай навучальнай установы, задаў адпаведны настрой і тон яе калектыву і кіраваў гэтым калектывам на працягу амаль 16 гадоў.

Было б, аднак, памылкова весці размову аб ім толькі як аб кіраўніку, арганізатары, няхай і таленавітым. Справа ў тым, што Аляксандр Васільевіч увесь час удала спалучаў адміністрацыйна-арганізатарскую дзейнасць з дзейнасцю навуковай, педагагічнай, асветніцкай. Ён напісаў і выдаў больш за 75 навуковых прац, з іх 8 манаграфій, падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, падрыхтаваў 5 кандыдатаў філасофскіх навук, быў рэдактарам цэлага шэрагу навуковых выданняў. Праблематыка яго навуковых твораў самая разнастайная: тут і традыцыйныя філасофскія праблемы - быццё, свядомасць, навуковае пазнанне; праблемы этыкі і эстэтыкі; праблемы, звязаныя з навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй; і, вядома ж, - праблемы вышэйшай і сярэдняй школы, выхаванне моладзі, фарміраванне асобы, развіццё сутнасных сіл чалавека і інш.

Аляксандр Васільевіч заўсёды мае актыўную жыццёвую пазіцыю, ён занепакоены лёсам краіны і яе народа. На працягу 20 гадоў яго выбіралі дэпутатам Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, пастаянна ўзначальвае абласную арганізацыю "Веды", Педагагічнае таварыства, ён член Прэзідыума Рэспубліканскай арганізацыі "Веды".

А.В. Бадакоў узнагароджаны медалём "За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І. Леніна", чатырмя Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, значкамі "Выдатнік асветы СССР", "Выдатнік народнай асветы БССР", яму прысвоена ганаровае званне "Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР".

І сёння, у дзень свайго юбілею, Аляксандр Васільевіч - малады, бадзёры, поўны сіл і энергіі, поўны творчых планаў і задумак, плённа працуе з моладзю, вучыць яе думаць, ацэньваць, выбіраць пэўную, грамадска значную пазіцыю і заставацца верным ёй.

Жадаем Аляксандру Васільеві- чу - Настаўніку, Філосафу, Грамадзяніну, Чалавеку - добрага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, напоўненых плённай творчай працай, здзейсненымі жаданнямі, дасягнутымі мэтамі, любоўю і павагай.

*Я. КАПЫТКА.*



*Фотаздымак з архіва.*

# Настаўнікаў не забываюць

У 1971 годзе я, студэнт Мінскага педагагічнага інстытута, атрымаў першую "аўтаматычную" пяцёрку па дыялектычным матэрыялізме. Чытаў нам лекцыі і прымаў экзамен Аляксандр Васільевіч. Такое шчасце выпала мне аднаму з групы [illegible]тмузаўцаў...

Праз пяць гадоў я нясмела пастукаўся ў дзверы кабінета рэктара Гродзенскага універсітэта. Аляксандр Васільевіч па-маладому энергічна выйшаў з-за стала мне насустрач і... здзівіў: "Здравствуйте, Фома!" Так, у пашпарце я - Фама, але мяне так ніхто ніколі не называў. Значыць - помніць, запомніў па заліковай кніжцы. Богам дадзеная чалавеку памяць! Я тады адразу падумаў: як у гэтай крутаверці клопатаў пра універсітэт не выпала ў яго гэта невялічкае звяно памяці! У яе куточку знайшлося месца і для мяне...

Даведаўся тады, што нядаўна пра мяне яму напомніў яго вялікі друг, энцыклапедычна дасведчаны вучоны, пісьменнік Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі - мой навуковы кіраўнік.

Ужо трэці дзесятак гадоў я кланяюся перад асобамі гэтых двух чалавек - Фёдара Янкоўскага і Аляксандра Бадакова. Яны сябравалі шчыра, іх дружба была глыбокай, інтэлігентнай, узорнай. Ужо няма сярод нас Янкоўскага. На пахаванне ў Мінск я ездзіў на рэктарскай "Волзе"... Яны радаваліся сустрэчам неяк асабліва, здаецца, не так, як усе мы, усміхаліся адзін аднаму і пры сустрэчах былі нешматслоўнымі. Па вачах "здымалі" інфармацыю пра час і пра сябе. Іншы раз я прывозіў з Мінска пісьмы-запіскі. Памятаю: у 1977 годзе я перадаў Аляксандру Васільевічу паштоўку друга - кароценькую, на 2-3 радкі запіску (прызнаюся: падгледзеў, калі чытаў яе рэктар). Там было: "Ведаю, што справы ў Вас ідуць добра. З Богам, дружа!"

Вялікія людзі ўмелі сябраваць. І ўмеюць. Гэта - своеасаблівае ўмельства, яно праходзіць праз сэрца. Нават гэта - не ўмельства, гэта непадробнае мастацтва шчырасці. Не ўсе так могуць...

Аляксандр Васільевіч - мой другі Настаўнік. Па-ранейшаму ён для мяне - рэктар і найвышэйшай пробы лектар-філосаф. Дай Бог яму здароўя! Заставайцеся з намі, Аляксандр Васільевіч, на доўгія гады! З Вамі святлей і цяплей, з Вамі - смялей... Не хочацца верыць "пашпартнаму ўзросту". І ўсё ж... З юбілеем Вас, дарагі Настаўнік! Да наступных юбілеяў - з бадзёрасцю духу, здаровай усмешкай і верай у лепшы дзень заўтрашні!

*Т. ТАМАШЭВІЧ,*
*загадчык кафедры беларускай мовы, в.а. дэкана факультэта філалогіі.*

## ВЕТЭРАНСКАЕ ДЗЯКУЙ!

*Шаноўны Аляксандр Васільевіч! Ветэранская арганізацыя універсітэта віншуе Вас з 70-годдзем. За час шматгадовай працы на пасадзе рэктара Вы заўсёды праяўлялі бацькоўскія клопаты пра нас, ветэранаў. Працуючы побач з Вамі, мы заўсёды адчувалі Вашу добразычлівасць і падтрымку. Ваша кампетэнтнасць, шчырасць, спагадлівасць станоўча ўплывалі і на нашу ветэранскую арганізацыю. Ваш арганізатарскі талент заўсёды спрыяў нашай агульнай справе. Сваёй прынцыповасцю, патрабавальнасцю і чалавечнасцю Вы заўсёды стваралі здаровы мікраклімат у калектыве.*

*У дзень Вашага юбілею шчыра жадаем Вам моцнага здароўя, новых поспехаў у навукова-педагагічнай працы, вялікага чалавечага шчасця!*

**Савет ветэранаў вайны і працы.**

# "ГЕНЕРАТОР" НОВЫХ ИДЕЙ



16 июля 1973 года - день, когда начался новый виток расцвета Гродненского государственного педагогического института имени Я. Купалы.

В этот знаменательный для гродненцев день освобождения города от немецко-фашистских оккупантов руководство педагогическим институтом было передано Александру Васильевичу Бодакову. И сразу развернулась работа по эстетическому оформлению вуза, совершенствованию всех видов его деятельности. Началось оборудование новых учебных кабинетов, переоборудование и оснащение старых.

А.В. Бодаков с первых дней в вузе являл собой генератор новых идей. Под его руководством интенсивно улучшалось методическое оснащение учебной, научной и воспитательной работы. Уже через год-два у нас стали проводиться конференции, совещания ректоров педагогических институтов республики. У нас было что показать, чем гордиться. Были налажены связи с филиалом Варшавского университета в Белостоке. Вся работа, проделанная коллективом нашего педагогического института под умелым руководством Александра Васильевича Бодакова, позволила достичь такого уровня деятельности вуза, что 1 мая 1978 года на базе института был открыт университет, которому спустя некоторое время было присвоено имя Янки Купалы. И опять - огромнейшая работа всего коллектива, руководимого А.В.Бодаковым, по переходу на новые учебные планы, оборудование учебных кабинетов, научных лабораторий, оснащение их новейшей техникой. А у ректора университета - опять новые идеи, новые задумки.

И сегодня мне, человеку, который 50 лет провел в стенах этого учебного заведения, приятно сказать добрые слова в адрес Александра Васильевича.

Большое спасибо за Ваше творческое отношение к труду, за Ваше всегда чуткое, но в то же время требовательное отношение ко всем работникам.

Желаю Вам, дорогой Александр Васильевич, крепкого здоровья, семейного благополучия, творческих успехов в труде, чтобы Вы еще многие годы отдавали свои знания студентам, чтобы у Вас могло учиться молодое поколение преподавателей.

С юбилеем Вас, Александр Васильевич!

***Л. КИРИЛЮК,***
***профессор.***

# СЕМ ГАДОЎ ПОПЛЕЧ

Так здарылася, што калі былы педінстытут у 1973 г. узначаліў А.В. Бадакоў, біялагічны факультэт быў ужо ліквідаваны. Але літаральна праз 10 гадоў намаганнямі рэктара біялагічны факультэт адрадзіўся. І тады ў 1986 г. я, 40-гадовы прафесар, доктар навук быў запрошаны на работу ва універсітэт у якасці загадчыка кафедры. Так выйшла, што ўжо праз паўгода я быў прызначаны прарэктарам па навуковай працы. Сем гадоў працы ў "камандзе" рэктара былі самымі яркімі ў маім жыцці. Мне пашчасціла папрацаваць поплеч са шматграннай, адметнай асобай з вялікім інтэлектуальным патэнцыялам, чалавекам чулым, добрым, адданым працы і калектыву, сумленным і ўдзячным.

Той факт, калі мае "дабрахвоты", і не без падставы, хуценька данеслі рэктару, што мне пасля перанесенай складанай аперацыі засталося нядоўга жыць, не быў прыняты ім да ўвагі, сведчыць, што наш паважаны Аляксандр Васільевіч быў і застаецца інтэлігентам "старой загартоўкі".

За сем гадоў мне неаднаразова давялося назіраць, як, без усякай для сябе карысці, чыніў рэктар людзям дабро. З чым толькі да яго не звярталіся!

Асабіста хачу адзначыць, як многа Вы зрабілі, паважаны Аляксандр Васільевіч, знаёмячы мяне са складаным прадметам чалавеказнаўства. Вось гэтаму ў Вас можна бясконца вучыцца. Тут шмат чаго б мог напісаць, але тады і газетнай старонкі не хопіць. Скажу галоўнае: Вы шчасліва сумяшчаеце нармальныя чалавечыя якасці з пачуццямі дзяржаўніка. Хто скажа, што і сёння не баліць Ваша душа за справы ва універсітэце, за гэта дзецішча, якое Вы стварылі і выпесцілі?

Цяпер Вам 70, наш былы Рэктар. Дзякуй богу, што Вы не блага сябе адчуваеце, а яшчэ лепей выглядаеце. Значыць, не жадалі Вы людзям благога, не рабілі ім шкоды, не заганялі ў куток, не "ламалі дроў", не ўзносіліся вышэй аблокаў. Таму і лад у душы Вашай. А пажадаць хачу я Вам добрага здароўя, дастатку шчаслівых момантаў у жыцці.

З 70-мі ўгодкамі!

*А. ВАСКАБОЕЎ,*
*прафесар, доктар навук,*
*загадчык кафедры біяхіміі і біятэхналогіі.*



# АБРАЗКІ ДА ПАРТРЭТА ЮБІЛЯРА

... Патэлефанаваў Чэслаў Станіслававіч Кірвель:

- Марыя Іосіфаўна, як вы ставіцеся да Аляксандра Васільевіча Бадакова?

- З вялікай сімпатыяй.

- Хутка яго юбілей. Хочаце напісаць колькі слоў аб ім у нашу газету?

Пауза. Вагаюся. І не таму, што не хачу. У душы спалоханы халадок: мне - напісаць - пра Яго?

Ці маю права? Ці не занадта вялікая дыстанцыя была паміж намі? Хоць яна з гадамі і скарачалася (сапраўды, параўнайце: студэнтка-завочніца - рэктар і дэкан - рэктар), але ж...

Згаджаюся. Бо, можа, я скажу тое, што бачыцца толькі мне. І мой погляд, мае ўспаміны, мая маленькая канкрэтыка - гэта неабходная аздоба ў віншавальны юбілейны букет Аляксандру Васільевічу. А складаць букеты - прыемная справа.

... 70-я гады. Рэктара мы, студэнты, бачым рэдка, на сходах. Падабаецца ўсім: прыгожым аблічам, цудоўнай рыторыкай, гожай паставай, прыветнай усмешкай, лёгкім гумарам, накіраванасцю ў будучае, марамі аб развіцці універсітэта.

... Выкладчыцкія будні і загадчыцкія клопаты 80-х. Калі-нікалі, акрамя сходаў і пасяджэнняў, сустрэчы ў яго кабінеце. Атрымліваю першыя ўрокі. (Не, мяне ніхто не вучыць, я вучуся сама, на сваіх памылках, але - у Яго). Напрыклад: уважліва чытай паперы, перш чым падпісваць, бо яны могуць быць проста непісьменна,прымітыўна напісаны. Або: ніколі не кажы катэгарычнае “не”, лепш дыпламатычнае “можа быць” ці проста змяні тэму размовы, пад канец праблема або знікне сама сабой, або вырашыцца самым неверагодным чынам. Ці: для кіраўніка няма дробязяў, усё важна: і колер сцен, і касцюмы універсітэцкага ансамблю, і настрой прыбіральшчыцы, і студэнцкі “хвост”.

Імпанавала смеласць, нават дзёрзкасць, з добрай доляй авантурызму, з якой Аляксандр Васільевіч распрацоўваў стратэгію развіцця універсітэта і прымаў рашэнні. І амаль дзіцячая даверлівасць да людзей, з якіх, дарэчы, далёка не ўсе апраўдвалі гэты давер.

Памятаю свой першы конкурс на пасаду выкладчыка, сапраўдны конкурс: на адно месца прэтэндавалі ўчарашняя студэнтка-завочніца без звання, без племені, але ж свая, і кандыдат навук, але з літоўскага тады яшчэ незамежжа. Не без дапамогі Аляксандра Васільевіча, з падачы маіх настаўнікаў савет выбраў мяне. А каб падвяла, не апраўдала б спадзяванняў? Рызыка? Тады, на кандыдацкім бязлюддзі, гэта было рызыкоўна. Але толькі цяпер, калі шмат якія запрошаныя заморскія госці-выкладчыкі паўцякалі, забраўшы універсітэцкія кватэры, стала яснай і тая галоўная ў стратэгіі рэктара стаўка на кадры сваёй гадоўлі.

Я не ведаю, якія зорныя часы былі ў Аляксандра Васільевіча, пэўна, іх было многа, як у кожнага прыгожага і з твару, і душой, і розумам чалавека, але мне здаецца, што самы зорны час быў у яго ў самы горкі дзень, у той злаўчасны дзень, калі даказаўшы правільнасць выбранага шляху, атрымаўшы татальную падтрымку ўсяго выкладчыцкага калектыву, Аляксандр Васільевіч склаў з сябе абавязкі рэктара.

Пайсці з пасады крышачку раней, чым ад цябе чакаюць - гэта Учынак! Як чэмпіёну пайсці з вялікага спорту, як акцёру ў зеніце славы - са сцэны...

І як самы вялікі, самы запамінальны для нас, філолагаў, жэст - гэта смеласць, з якой Аляксандр Васільевіч у неспрыяльны і небяспечны для сябе час узяў на сябе адказнасць выдаткаваць грошы на выданне кнігі Г.Н. Клюсава. Выратаваць беларускую кнігу ад забыцця! Ды ўжо толькі за адно гэта Бог Вам набавіць добрых два дзесятка гадоў - столькі, колькі аўтар кнігі паклаў на яе напісанне. Ці не ў такіх учынках - падхапіць і панесці далей светач пісьменства і розуму - чалавечае бяссмерце?

А нядаўна я зноў адчула свята душы, калі пасля няўдалага, коснаязыкага выступлення адной прыезджай высокапастаўленай асобы ўстаў Аляксандр Васільевіч Бадакоў і ў сціслай, па-цыцэронаўску прыгожай прамове дыпламатычна, але сурова не толькі выказаў усё, што набалела ў сэрцах нашай універсітэцкай брацii, але і даў парады, як на дзяржаўным узроўні ратаваць інтэлект нацыі.

І нельга было не залюбавацца гэтым чалавекам, як нельга было не адчуць гордасць за яго і тады, калі ён, былы рэктар, нядаўна на савеце абараняў цяперашняга рэктара ў імя навукі, у імя калектыву, у імя універсітэта, які ён стварыў, якому служыў і якому працягвае служыць.

З цудоўным, паўнакроўным, шчаслівым юбілеем Вас, Аляксандр Васільевіч!

*М. КАНЮШКЕВІЧ,*
*доктар філалагічных навук,*
*прафесар, заг. кафедры рускай мовы.*



*Фотаздымак з архіва.*

# С ВЫСОТЫ ФИЛОСОФСКОЙ МЫСЛИ

Многие из нас, молодых аспирантов, тогда впервые встретились с этим удивительным, мудрым человеком.

Очень хорошо запомнился тот день, когда Александр Васильевич впервые зашел к нам в аудиторию: с доброй улыбкой на лице, с изучающими, живыми глазами, с царственной осанкой. Его лекции по философии - это не наставления корифея, а диалог, в котором чувствуешь себя равноправным участником. Александр Васильевич умеет так повести диалог, что после него наступает просветление, видишь, что вокруг тебя не просто хаос, не просто бесцельное движение, а все подчинено определенной закономерности, все имеет свое место, цель и форму.

После каждой встречи остается впечатление, что Александр Васильевич во всем докапывается до самой сути. Учит он этому и нас.

А еще Александр Васильевич помогает нам переосмыслить жизнь, посмотреть на нее с высоты философской мысли. Через философское понимание бытия, он, Учитель, ведет нас к сокровенным глубинам человеческой жизни, к тем коренным вопросам, которые человек должен ставить перед собой в минуты высочайшего напряжения духовно-нравственных сил.

Александр Васильевич - Личность, Учитель, Мудрец, совмещающий в себе лучшие черты людей своего поколения, несущий свет и радость общения нам, молодым представителям научного мира.

Те, кто встречаются с Учителем, слушают его, вторят его мыслям, навсегда сроднятся с его миропониманием и оставят в своей памяти образ его Личности.

Спасибо Вам, Александр Васильевич, за Вашу мудрость, терпение, доброе отношение к нам.

*С любовью и уважением*
*аспиранты*
*университета.*

**Рэдакцыйная калегія.**
**Камп'ютарная вёрстка:**
**Ю.РАДСА, М.КАРНАЎХАВА**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404.*
☎ *44-72-97*

Газета выходзіць адзін раз у месяц.
Аб'ём - 1 друк. арк.

*Здадзена ў набор 14.02.96 г.*
*Заказ* 3
*Наклад 200 асобнікаў.*

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №421.

*Заснавальнікі: Вучоны Савет універсітэта, прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў.*